ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

Газета для рабочых №5 лістапад 2009 г.

# СПРАВЫ ЗАВАДЗКІЯ



**Мінулы месяц і пачатак гэтага былі багатыя на навіны і падзеі, якія датычацца нашага завода. Зробім невялікі агляд.**

### *Загады – незаконныя?*

Лідская міжраённая інспекцыя працы прызнала, што загады кіраўніцтва завода аб няпоўным працоўным дні парушаюць заканадаўства Беларусі. А калі загады незаконныя, то яны павінны быць адмененыя, таму ёсць магчымасць атрымаць кампенсацыю за вымушаны прастой не па віне работніка.

*Карысная парада для рабочых: перш, чым падпісваца пад якімі-небудзь паперкамі, што падсоўвае начальства, пачытайце, пад чым падпісваецеся. Адмаўляцца падпіс-ваць не мае сэнсу, пісаць “не згодны” – нават небяспечна, бо могуць звольніць за непадпарадкаванне. Найлепшы варыянт – пісаць “азнаёмлены”, паставіць дату і подпіс. Азнаямленне не з’яўляецца згодай, і таму загад можа быць аспрэчаны.А пастаўленая вамі дата будзе сведчыць, ці азнаёмленыя вы з загадам адпаведна закону.*

### *Крышталь спатрэбіўся?*

Ванную печ №12 раптам хуценька склалі і запалілі. Хаця яшчэ 1 кастрычніка ў загадзе № 577 адзначалася немагчымасць рамонту печы, 8-га яе пачалі раман-таваць – знай-шліся і грошы, і матэрыялы. Ці не спрычынілася да гэтага тое, што загады прызналі незаконнымі? На гэтае пытанне адказу нам не дачакацца.

Магчыма, патлумачаць гэта павышэннем попыту на крышталь. Але вось дзіўная рэч: крышталь і так не залёжваўся на складах, у адрозненне ад вырабаў з безкаляровага шкла, якімі завалены ўвесь завод (і не толькі). Адзін дасведчаны ў маркетынгу чалавек распавёў, як кіраўнікі прадпрыемстваў “пракручваюць” фінансавыя аферы: ствараецца штучны дэфіцыт тавару (нібыта няма збыту), а тым часам гэты тавар ляжыць на складах. Напрыканцы году паступае каманда: любымі спосабамі разгрузіць склады, нават прадаваць ніжэй сабекошту. І тут адразу з’яўляюцца “пакупнікі” – людзі, якія заране дамовіліся з дырэктарам, набываюць прадукцыю за бясцэнак, і атрымліваюць пасля звышпрыбыткі. Зразумела, што дзеляцца з кіраўнікам прадпрыемства.

Вось і ў нас, складскія запасы на мільярды рублёў створаныя за кошт назапашвання вырабаў з без-каляровага шкла. Крышталю апошнім часам выраблялі мала, таму стварыўся штучны дэфіцыт. Зараз, за апошнія месяцы да канца

***заканчэнне на старонцы 2***

## НЕЗАЛЕЖНЫЯ ПРАФСАЮЗЫ – ЗА ГОДНУЮ ПРАЦУ

7-га кастрычніка ў Мінску адбыўся мітынг незалежных прафсаюзаў, прысвечаны Ўсясветнаму дню барацьбы за годную працу.Удзел у мітынгу, не гледзячы на кепскае надвор’е, ўзялі некалькі соцень чалавек, сярод якіх, паводле нашай інфармацыі, было некалькі рабочых шклозавода “Нёман”. Адзін з іх распавёў прысутным пра сітуацыю на нашым прадпрыемстве. Большасць прысутных была з Мінску і іншых буйных гарадоў Беларусі, таму людзі былі ўражаныя нізкімі заробкамі і беззаконнем кіраўніцтва на шклозаводзе “Нёман”.

На мітынгу была прынятая рэзалюцыя ***( тэкст рэзалюцыі – на старонцы 3).***

— — — — — — — — — — — — —

## У ДЫРЭКТАРА – ЯШЧЭ АДЗІН НАМЕСНІК

***Штат заводзкой адміністрацыі працягвае павялічвацца. Чытайце на старонцы 4.***

— — — — — — — — — — — — —

***Ці ёсць будучыня ў беларускай кантрактнай сістэмы?***

***Што чакаць ад пенсійнай рэформы?***

**а таксама пра адно**

***выпадковае адкрыццё***

**ды іншыя матэрыялы**

***чытайце ў наступным нумары! Заставайцеся з намі!***

ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

# СПРАВЫ ЗАВАДЗКІЯ (працяг са стар.1)

году, калі крышталь будзе вырабляцца на двух печках, а вытворчасць простага шкла зменшыцца, можна будзе утрымліваць колькасць складскіх запасаў на адным узроўні, адначасова ствaрыўшы ладны "запас" вырабаў з крышталю, не павялічваючы продаж. А калі прыйдзе каманда на разгрузку складоў – "з чыстым сумленнем" здаць тавар сваім паплечнікам, атрымаўшы пры гэтым і ладны кавалак для сябе.

Тут не сцвярджаецца, што на нашым заводзе менавіта такое адбываецца, але хто ведае…

### *Яны клапоцяцца пра рабочых?..*

Запаліўшы крышталёвую печ, вырашылі патушыць адну печ з безкаляровым шклом. А дзеля роўнасці, каб нікому не было крыўдна, рабочых з трох печаў размеркавалі на двух, і склалі графік працы па 6 гадзін у 5 зменаў. Праўда, ўсё роўна ўсіх людзей прыстроіць не атрымалася. Частка пойдзе на крыштальныя печы, там ёсць крыху вольных месцаў. А што рабіць з астатнімі людзьмі, якім не хопіць месцаў, невядома. Па розных звестках, без працы могуць застацца каля 200 чалавек.

Цікава, што прычынай, па якой зліваюць печ №1, адміністрацыя завода называе загад эканоміць газ, хаця Расія ледзь не наклала на Беларусь штрафныя санкцыі за недабор дамоўленых аб'ёмаў газу. Відавочна, што прычыны тут іншыя, а хутчэй за ўсё прычына адна – скарацiць вытворчасць.



### *Рабочых "дасталі"*

Найбольшую рэакцыю меў загад адміністрацыі завода аб падвышэнні нормаў выпрацоўкі на 20% (на некаторыя вырабы – на 50%!). Гэтая навіна выклікала, можна сказаць, шок у рабочых. У той час, калі большасць брыгад у гуце выконваюць план у межах 105-110%, новыя нормы выконваць было б немагчыма. І, хаця рабочых хацелі запэўніць, што заробкі не зменшацца, ніхто не паверыў. Бо калі за тыя ж грошы трэба зрабіць на 20% болей, то як гэта назваць, як не змяншэннем заробкаў? Да таго ж, як ужо адзначалася, не ўсе брыгады змаглі б выконваць новыя нормы, і адпаведна, атрымліваць даплаты за майстэрства, прагрэсіўку. Рэальна заробкі зменшыліся б на 15-20%.

І Гэта магло б адбыцца, калі б рабочыя не наважыліся звярнуцца ў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, а дакладней – да самага міністра. Па інфармацыі, якая прайшла амаль па ўсіх незалежных СМІ, пад зваротам падпісалася крыху болей за 1000 чалавек. Ужо сам факт, што рабочыя збіраюць подпісы, прымусіў замітусіцца кіраўніцтва завода. З боку начальства былі спробы перашкодзіць збору подпісаў – некаторыя начальнікі зменаў забіралі і знішчалі падпісныя лісты, запалохвалі рабочых пакараннямі. Ды толькі высілкі іх былі марнымі.

### *Салідарнасць спрацавала*

Пасля таго, як рабочыя завода адправілі калектыўны зварот у міністэрства, на завод пачалі адна за адной прыязджаць праверкі ды інспекцыі.

Самымі першымі, па нашых звестках, прыехалі прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў. Падрабязнасці іх візіту нам не вядомыя, але кажуць, што размова з кіраўніцтвам завода была "жорсткая". Якую ацэнку далі дзеянням прафкаму таксама невядома, хаця можна здагадацца, што не ўхвалілі (загад пра падвышэнне нормаў быў узгоднены з прафкамам).

Услед за прафсаюзнікамі прыехала камісія з Лідскага райвыканкаму. Гэткія "пасярэднікі ў перамовах, міратворцы". Кажуць, што яны нават сустракаліся з некаторымі брыгадзірамі, выслухалі іх меркаванне і загадалі кіраўніцтву завода правесці шырокі сход брыгадзіраў, каб абмеркаваць праблемы і знайсці кампраміс.

(Што цікава, гэтыя камісіі пачалі прыязджаць на завод яшчэ да таго, як у міністэрстве атрымалі зварот рабочых. Як такое магло здарыцца? Адказ просты: інфармацыя пра падзеі на нашым заводзе некалькі дзён была ў цэнтры ўвагі амаль усіх незалежных СМІ. Ну, а інфармацыю гэтую, вядома ж, чытаюць не адныя апазіцыянеры, спецслужбы старанна адсочваюць кожную навіну і прымаюць меры. )

Кіраўніцтва завода, можна сказаць, выканала загад райвыканкама, але на свой капыл: яны правялі "савет майстроў", праўда цяжка зразумець, хто гэтых майстроў выбіраў ці прызначаў. А на гэты "сход" прывезлі Лідскае тэлебачанне! Зразумела, якія праблемы там абмяркоўваліся. Казалі, што вадзіцель дырэктара перад камерай вельмі нахвальваў свайго шэфа, які ён клапатлівы і сумленны. Ну, хто б сумняваўся. Хацеў бы я паглядзець гэтае "шоў", але ж тэлевізара не гляджу.

Як той казаў, "падзеі развіваюцца імкліва". Пабачым, які будзе вынік. Яшчэ ж міністэрства не сказала свайго важкага слова. Але на дадзены момант працоўная салідарнасць перамагае. Пакуль зразумела адно: нельга болей маўчаць і пагаджацца на нялюдскія адносіны да рабочых. Далей ужо – няма куды.

***Л.Някозік***

# Рэзалюцыя мітынга Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў, прысвечанага Ўсясветнаму дню барацьбы за годную працу 7 кастрычніка 2009 г.

## "Аб праве грамадзян Беларусі на годную працу"

Удзельнікі мітынга, прысвечанага Ўсясветнаму дню барацьбы за годную працу, выступаючы салідарна з міжнародным прафсаюзным рухам у рамках адзіных дзеянняў за годную працу, заяўляюць, што ў Рэспубліцы Беларусь сучасная сітуацыя ў сацыяльна-эканамічнай і працоўнай сферах характарызуецца істотным пагаршэннем становішча працоўных.

Канстытуцыйнае права грамадзян Рэспублікі Беларусь на працу, як найбольш годны спосаб самасцверджання чалавека, г.зн. права на выбар прафесіі, рода заняткаў і работы ў адпаведнасці з пакліканнем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбаў, практычна перакрэслена прыніжальнай сістэмай тэрміновых працоўных кантрактаў.

Дзяржава не ў стане стварыць умовы для поўнай занятасці насельніцтва і забяспечыць узровень заработнай платы, дастатковы для свабоднага і годнага існавання работнікаў і іх сем'яў.

Большасць прадпрыемстваў краіны працуе ва ўмовах няпоўнага працоўнага тыдня. Работнікаў вымушаюць сыходзіць у адпачынкі без захавання заработнай платы. Заработная плата ў Беларусі ў 2,5-3 разы ніжэй, чым у краінах Балтыі і Польшчы, у 1,5 разы ніжэй, чым у Расіі. Сацыяльная абарона работнікаў, якія атрымалі траўмы і прафесійныя захворванні не гарантуецца. Дапамога па беспрацоўю складае менш чым 30 долараў ЗША. Кошты на прадукты харчавання, камунальныя паслугі, медычнае абслугоўванне, адукацыю пастаянна падвышаюцца.

Грамадзяне не могуць аб'ядноўвацца ў прафсаюзы для абароны і прадстаўніцтва сваіх законных правоў і інтарэсаў. Нягледзячы на рэкамендацыі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) і пазбаўленне краіны гандлёвых прэферэнцый Еўрасаюзам, парушэнні правоў незалежных прафсаюзаў і працоўных працягваюцца.




Удзельнікі мітынга, ўсведамляючы значнасць зацверджаных МАП крытэрыяў годнай працы, з мэтай выканання асноўных сацыяльна-працоўных правоў чалавека і стварэння годных умоваў працы, патрабуюць ад ураду краіны забяспечыць:

-роўныя магчымасці рэалізацыі права на працу для ўсіх грамадзян краіны; дасяжнасць вытворчай і значнай работы;

-вяршэнства кодэкса законаў аб працы, адмена сістэмы тэрміновых працоўных кантрактаў, г.зн. Дэкрэта №29, якая супярэчыць міжнародным нормам, Канстытуцыі і Працоўнаму Кодэксу;

-выплату работнікам, звольненым па сканчэнні тэрміну кантрактаў, дапамогі ў памеры трохмесячнага сярэдняга заробка;

-годны даход, які забяспечвае годныя ўмовы да існавання;

-добрыя ўмовы працы, ахову працы і бяспеку на працоўным месцы;

-свабоду слова, мітынгаў, сходаў;

-адсутнасць дыскрымінацыі ў працоўных адносінах, у тым ліку па прыкмеце прыналежнасці да незалежных прафсаюзаў;

-роўны ўдзел мужчын і жанчын у прыманні вырашэнняў;

-права на свабоду аб'яднання ў прафсаюзы і вядзення калектыўных перамоваў;

-абарону ад страты або змяншэння даходаў па прычыне беспрацоўя, траўмы, мяцярынства, бацькоўства ці старасці;

-выплату дапамогі па беспрацоўю ў памеры не менш мінімальнага спажывецкага бюджэта;

-працуючым пенсіянерам выплату пенсіі і зарплаты ў поўным аб'ёме;

-справядлівы грамадскі ўдзел у вырашэнні сацыяльных пытанняў.

**Працоўныя Беларусі! Аб'яднаем намаганні ў барацьбе за годную працу! Годная праца – годная будучыня!**

## У дырэктара – яшчэ адзін намеснік

У мінулым месяцы па Лідскім тэлебачанні можна было прачытаць аб’яву прык-ладна наступнага зместу: ”Шклозаводу “Нёман” пат-рабуецца намеснік дырэк-тара па рэжыму, пажадана з досведам працы ў МУС”.

Новая вакансія не доўга была вольнай, неўзабаве знайшоўся патрэбны чала-век. Гэта нехта Ахметаў Ахмет Ісаевіч (прабачаемся, калі напісана з памылкамі, вашых дакументаў не бачылі!), былы афіцэр міліцыі з Ліды.

Вядома ж, не нам выра-шаць кадравую палітыку завода, але незразумела, чаму раптам спатрэбілася яшчэ адна пасада, ды й такая мудрагелістая? Няўжо служба аховы ўжо не задавальняе ўсе наяўныя праблемы? Дык жа на заво-дзе даўно не крадуць (хіба што па драбязе, тыя, хто не можа спаць не ўкраўшы). Ці можа наш завод стаў ці стане рэжымным прадпрыемствам, сакрэтным? Будзем выпус-каць нейкую зброю? Ніхто пра гэта не чуў.

Дарэчы, спадар Ахметаў ужо паспеў “праявіць піль-насць” на новай пасадзе: не без яго ўдзелу былі затры-маныя журналісты неза-лежных СМІ і канфіскаваныя знятыя імі матэрыялы (пра гэтае здарэнне паведамілі многія інтэрнэт-рэсурсы). Магчыма, “нячэсныя” жур-налісты збіраліся правесці на нашым заводзе ідэалагічную ці, не дай Божа, палітычную дыверсію. Будзем спадзя-вацца, што пільнасць дас-ведчанага змагара з ворагамі дапаможа нашаму прадпры-емству ўзняцца на вяршыні міравой эканомікі.

Калі б ад таго, што ў адміністрацыі завода павя-лічваюць штат, у рабочых павялічваўся заробак, нікога б гэта не зацікавіла. У нас жа назіраецца адваротнае: рознага начальства ўсё болей, а карысці ад іх не адчуваецца.

Што ж, пабачым, ці будзе эканамічная карысць для прадпрыемства ад новага намесніка дырэктара.

*П.Кілішкевіч*

## Камітэт дзяржбяспекі ці галоўнае ўпраўленне аддзеламі кадраў?

У сённяшняй Беларусі вядома шмат выпадкаў, калі людзей звальняюць з працы ці адлі-чаюць з ВНУ на загад (ці “рэка-мендацыю”?) спецслужбаў. Пералічыць гэтыя выпадкі не хопіць фармату нашай газеты. Зазвычай звальняюць грамад-ска актыўных людзей, якія не баяцца выказваць свае пагляды на існуючую сістэму, не баяцца ўдзельнічаць у дэмакратычных арганізацыях, і мерапрыемс-твах, якія яны ладзяць. Нату-ральна, такім чынам рэжым хоча запалохаць людзей, зрабіць іх пасіўнымі і паслухмянымі пад страхам страціць працу.

Але насуперак усім метадам спецслужбаў, колькасць такіх людзей не змяншаецца, а наадварот, апошнім часам нават павялічваецца. Свабоднага чалавека не запалохаць!

*ЯН*

### сцісла і ёмка

### Павесялілі

Небывалы прыліў аптымізму, які выяўляўся ў адных шчырымі ўсмешкамі, ў другіх - прыступамі смеху, адчувалі рабочыя завода, чытаючы апошні інфармацыйны бюлетэнь прафсаюза. Яны, бедалагі, і не ведалі, што заробкі на заводзе ад пачатку года павялічыліся амаль на 9%!

Не зразумела, якім чынам атрымалася лічба 685 тысяч рублёў (сярэдні заробак па заводзе за 9 месяцаў) у параўнанні з 625 тысячамі рублёў (сярэдні заробак за мінулы год). У каго з рабочых не запытайся, нікому ніякага падвышэння не было, наадварот, многія скардзяцца на змяншэнне заробкаў.Да таго ж, два месяцы (жнівень і верасень) два цэха працавалі па 4 гадзіны, а служачыя адміністрацыі наогул па 4 гадзіны працуюць з вясны.

Адно з двух: ці то гэтыя "інфарматары" лічыць не ўмеюць, ці то трымаюць людзей за дурняў.

• • • • • • • • • • •

### Голас народа

На сайце **http//biarozauka. belarda.org** праводзілася апытанне на тэму “Як змянілася Вашае матэрыяльнае стано-вішча за апошні год”. Адказы размеркаваліся наступным чынам: “Значна палепшылася” – 0%, “Крыху палепшылася” – 5%, “Не змянілася” – 10%, “Пагор-шылася” – 40%, “Значна пагор-шылася” – 45%.

Без каментароў. Хіба можна адзначыць, што абсалютная большасць наведнікаў сайта – жыхары Бярозаўкі.

**Працоўная салідарнасць**
*Інфармацыйна-аналітычнае выданне*
*г.Бярозаўка*
*Рэдактар і выдавец П.Кілішкевіч*

*Распаўсюджваецца бясплатна*
*Наклад 299 экз.*
*Друкарня “Вольны працаўнік”*
*Адказны за выпуск Я. Нязгодны*
*E-mail: hutanioman@gmail.com*